**ГІСТАРЫЗМ** у архітэктуры, тэндэнцыя да ўзнаўлення архітэктурных форм і элементаў мінулага сродкамі маст. мовы. Існуе як неад'емная складаючая архіт. стыляў і кірункаў. Г. выяўляе адносіны чалавека і грамадства да мінулага сродкамі апеляцыі да гіст. архетыпаў. Узнік у эпоху Адраджэння як праява імкнення да ўзнаўлення антычных узораў. Г. архітэктуры класіцызму (*Шчучынскі палац*) выяўляў логіку фасадных чляненняў рэнесанснага дойлідства. У архітэктуры мадэрна (будынак банка ў г. Слонім) Г. праявіўся на ўзроўні ўхвалення сярэдневяковых і барочных збудаванняў. Г. знайшоў яскравае адлюстраванне ў архітэктуры канца 19 — пач. 20 ст. (*Мінскі касцёл Сымона і Алены*). З'яўляецца адметнай асаблівасцю неа- і рэтрастыляў: неакласіцызму (*Маладаўская капліца*, *Мілавідская мемарыяльная капліца*, *Салтанаўская мемарыяльная капліца*), рэтраспектыўна-рус. стылю (*Мількаўшчынская Пакроўская царква*, *Першамайская Пакроўская царква*, *Богінская Пакроўская царква*) і інш. Новыя версіі Г. праявіліся ў архітэктуры постмадэрну (будынкі чыгуначнага вакзала ст. Парэчча Гродзенскага р-на, «Белаграпрамбанка» ў Лідзе, філіяла «Брэсткамбанка» ў Пінску, паліклінікі на праспекце Пераможцаў у Мінску), дзе ён не выключаў прамога капіравання, але пераважна быў накіраваны на ўзнаўленне характару стыляў і кірункаў мінулага сродкамі цытавання асобных элементаў гіст. пабудоў. У выніку Г. архітэктуры постмадэрнізму атрымаў розныя праявы: гармансічнае ўключэнне ў архіт. аб'ект гіст. цытацый ці рэмінісцэнцый, гіпербалізацыю архіт. элементаў, змешванне і напластаванне стылявых матываў у адным аб'екце, капіраванне гіст. пабудоў (эклектызм), акцэнт на знешні эфект (кіч). *Ю.Ю.Захарына.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ